С. В. Барыс *(г. Мінск)*

# РАЗВІЦЦЁ АСВЕТЫ І АДУКАЦЫІ Ў НАРАЧАНСКІМ КРАІ Ў XIX–XXI стст.

У Расійскай імперыі ў 1803–1804 гг. была праведзена школьная рэформа, згодна з якой сталі адкрываць царкоўна-прыходскія школы (ЦПШ) для дзяржаўных сялян, настаўнікамі ў якіх часцей за ўсё былі мясцовыя святары. Так, у 1863 г. некалькі школ на Вілейшчыне (у вёсках Занарач, Ганута, Іжа, Нарочa) праваслаўныя святары адкрылі ў сваіх прыходах пры цэрквах. У вёсцы Іжа, напрыклад, святар Адам Андрушкевіч вёў заняткі ў хаце прыхаджаніна, вучыў 26 хлопчыкаў. У 1886 г. пачаліся заняткі ў рухомай школе (па хатах сялян) у вёсцы Касічы. Тут вучыліся грамаце 13 хлопчыкаў. Раней, чым у вёсках, у 1860 г., адкрылася земскае народнае вучылішча ў мястэчку Войстам.

Пасля адмены прыгоннага права той жа святар Адам Андрушкевіч адкрыў у Іжы пры царкве вучылішча для сялянскіх дзяцей, якое пазней стала народным вучылішчам і размяшчалася бясплатна ў хаце, пабудаванай сялянамі на царкоўнай зямлі. Памешчык Іван Любанскі выдзеліў на гэтыя мэты 240 бярвёнаў і 80 жэрдак. На ўтрыманне вучылішча адпускалася 200 рублёў у год з дзяржаўнага казначэйства. У 1890 г. навучаліся ў вучылішчы 81 хлопчык і 15 дзяўчынак. У 1870 г. заснавана Нароцкае народнае вучылішча, якое размяшчалася ў грамадскім памяшканні бясплатна. На яго ўтрыманне выдзялялася 209 рублёў у год са збору з 6 дзяржаўных сялян. Некаторыя вучні, якія скончылі народнае вучылішча, ішлі працаваць настаўнікамі ў школу граматы. Асабліва вылучыліся ў гэтай справе навучэнцы Іжскага вучылішча – гэта І.І. Місюль, В.Л. Жыхар, Л.Ф. Лях, Я.К. Місюль, В.І. Путырскі. З 1884 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у в. Калодкі дзейнічала рухомая школа граматы, якая пазней была ператворана ў народную школу. Царкоўна-прыходскія школы былі створаны ў Каралеўцах (1893), у Іжы – жаночая ў 1901 г., якія размяшчаліся ў казённых памяшканнях, у Слабадзе ў 1897 г. у наёмным памяшканні. Да 1902 г. у аднакласных ЦПШ быў двухгадовы, а ў двухкласных – чатырохгадовы тэрмін навучання, а ў наступным годзе курс навучання ў абодвух відах школ быў павялічаны на адзін год. Такім чынам, двухкласная ЦПШ стала пяцігадовай.

У 1880-я гг. пачатковая школа пашырала асвету і культуру. Яна давала не толькі агульную адукацыю, але і практычныя веды па сельскай гаспадарцы, агародніцтве і садоўніцтве.

У 1891 г. у Гануце адчынена царкоўна-прыходская жаночая школа для 70 дзяўчынак. Тут дзейнічала таксама школа граматы і мясцовае двухкласнае народнае вучылішча. У 1912–1913 гг. у ім настаўнічаў Рыгор Раманавіч Шырма. Невядомы тады ў музычных колах, у хуткім часе ён стаў знакамітым музыкам і дырыжорам, арганізаваў у 1940 г. у Мінску Беларускую харавую капэлу. З 1978 г. Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла носіць яго імя.

У 1901 г. адчыніліся школы граматы ў вёсках Родзевічы, Канаціха, Дварэц.

Народныя вучылішчы былі аднакласныя і двухкласныя. Заняткі ў іх павінны былі пачынацца 1 верасня і заканчвацца ў канцы красавіка. На самай справе яны пачыналіся пасля заканчэння палявых работ у сярэдзіне кастрычніка, а спыняліся ў сярэдзіне красавіка з пачаткам работы ў полі.

На пачатку XX ст. школы граматы дзейнічалі ў вёсках Жалезнікі, Пронькі, Дзям’янавічы, Лыцавічы, Ролічы, Муляры, Роткавічы, Доўгія, Касічы, Вайдзені, Ярмолічы, Ручыца. Аднакласныя царкоўна-прыходскія школы знаходзіліся ў мястэчках Вішнёва, Спягла, вёсках Занарач, Ганута, Рацавічы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Школы граматы ўтрымліваліся за кошт сельскай грамады, яны, як правіла, не мелі свайго памяшкання і часта былі рухомыя: гэта значыць, што заняткі праводзіліся ў розных хатах. Царкоўна-прыходскія школы ўтрымліваліся і ствараліся прыходам пры царкве. Заняткі ў школах вёў або святар, або настаўнік. Але ва ўсіх пачатковых школах урокі Закону Божага праводзіў святар свайго прыходу.

У Нарачанскім краі на пачатку XX ст. былі народныя вучылішчы: Вузлянскае, Войстамскае, Гануцкае, Зана-рацкае, Рускасельскае, Спяглаўскае, Кабыльніцкае, якія ўтрымліваліся за дзяржаўны кошт і давалі больш поўную пачатковую адукацыю. Пасля іх заканчэння можна было працягваць навучанне ў павятовых вучылішчах альбо гімназіях.

Падчас Першай сусветнай вайны школы не працавалі. Пасля ўстанаўлення на тэрыторыі Заходняй Беларусі польскай улады адкрываць тут беларускія школы не дазвалялася. Заняткі ў школах пачаліся ў 1921 г., у самым пачатку яны вяліся на польскай або беларускай мовах, а затым школы ператварылі ў польскія паўшэхныя 4-класныя або 6-класныя. У гімназію прымаліся толькі вучні, якія скончылі 6 класаў паўшэхнай школы. За навучанне трэба было плаціць вялікую плату, таму вучыцца ў гімназіі маглі пераважна дзеці заможных бацькоў. У польскай гімназіі тэрмін навучання быў 6 гадоў (4 гады гімназіі і 2 гады ліцэя). Беларуская гімназія вяла навучанне ў Вілейцы.

У кожнай гміне было некалькі паўшэхных школ. Аднак вельмі часта бацькі не маглі вучыць сваіх дзяцей, бо гэта былі для іх залішнія расходы. Яны рана прыцягвалі дзяцей да працы па гаспадарцы. Дзяржаўныя ўстановы пры польскай уладзе карысталіся польскай мовай. Да 1924 г. у Заходняй Беларусі знаходзіліся ў абарачэнні польскія маркі, якія з гэтага года замяняліся на польскія злотыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1924 г. сейм па патрабаванні дэпутатаў прыняў закон аб роднай мове і школе, але ажыццявіць яго на практыцы было цяжка. Каб адкрыць беларускую школу трэба было сабраць не меней як 40 вучняў. Затым іх бацькі павінны былі напісаць у гміне дэкларацыю-прашэнне. Затым дэкларацыю неслі да школьнага інспектара.

Польска-беларускія дзяржаўныя (пяцікласныя) школы былі ў Іжы, Каловічах, Залессі. Прыватныя беларускія школы дазваляліся, але на Вілейшчыне іх не было.

У 1924 г. пачатковых школ у Нароцкім прыходзе Свята-Ільінскай царквы было 4: у Нарочы, Бараўцах, Касічах і Папоўцах. У іх вучылася каля 120 праваслаўных хлопчыкаў і 30 дзяўчынак. А праз два гады засталіся школы толькі ў Бараўцах і Нарочы, але ў іх колькасць вучняў даходзіла да 160. У 1928 г. адкрылася пачатковая школа ў Кузьмішках, у якой быў адзін настаўнік. У Бараўскай школе было дзяцей шмат, і там заняткі вялі ўжо 3 настаўнікі. У 1932 г. колькасць вучняў у школах павялічылася: у Нарочы – да 120, Кузьмішках – да 82, у Бараўцах – да 186. У 1936 г. адкрылася пачатковая школа ў в. Мардасы.

Далучэнне Заходняй Беларусі да БССР паспрыяла развіццю асветы і адукацыі. Адкрываліся хаты-чытальні і клубы. Старыя пачатковыя школы захоўваліся і адкрываліся новыя. Усе школы ў Нарачанскім краі вялі навучанне дзяцей па-беларуску. У кожным сельсавеце дзейнічала некалькі школ. Ставілася задача ліквідаваць непісьменнасць насельніцтва.

У часы Другой сусветнай вайны акупацыйнае нямецкае камандаванне сваю палітыку імкнулася ажыццяўляць не пры дапамозе «гарэлкі, тытуню і бізуна», а накіраваць яе на культурнае адраджэнне. Навучальны год намячалася пачынаць з першага кастрычніка. Усе дзеці з 7 да 14 гадоў, за выключэннем яўрэйскіх, павінны былі вучыцца ў школе. Школы, якія існавалі да вайны, былі зноў адчынены. Яны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

называліся «народныя школы» і давалі пачатковую адукацыю. У Вілейскай акрузе налічвалася 429 такіх школ. Аднак трэба лічыць, што гэта лічба завышана. Беларускія пачатковыя школы былі адкрыты ў мястэчках і некаторых вёсках (напрыклад, у Бараўцах, Нарочы, Кузьмішках, Іжы ды інш).

У школе вывучаліся беларуская мова і літаратура, прыродазнаўства, батаніка і заалогія, геаграфія, матэматыка, спевы, ручная праца і фізкультура. У «народнай школе» было 7 класаў. Заняткі праводзіліся на беларускай мове. Закон Божы вывучалі па-за школай. У школах не хапала падручнікаў, бо забаранялася карыстацца савецкімі і польскімі, а новых не было. Настаўнікі часам карысталіся савецкімі падручнікамі, выкінуўшы з іх звесткі пра савецкіх кіраўнікоў. Часова выкарыстоўвалі педагагічны часопіс «Беларуская школа», дзе друкаваліся неабходныя для ўрокаў матэрыялы. У Мінску было створана педагагічнае выдавецтва, якое толькі ў канцы акупацыі змагло выпусціць некалькі падручнікаў для школы лацінскім шрыфтам: «Bielaruski lemantar» (Менск, 1942) П. Кіселя; «Bielaruski pravapis» (Менск, 1943) А. Лёсіка; «Кніжка вучыцца чытаць і пісаць лацініцаю» (Менск, 1943) Я. Станкевіча і інш.

Школьных настаўнікаў рыхтавалі ў Вілейскай настаўніцкай семінарыі, дзе існавалі тры курсы для навучання. У семінарыю прымалі тых, хто меў адукацыю 7 класаў савецкай школы альбо 5 класаў польскай. Для падрыхтоўкі настаўнікаў адкрылі яшчэ настаўніцкую семінарыю і ў Маладзечне. У Вілейскай настаўніцкай семінарыі дзейнічала студэнцкая суполка Беларускі саюз моладзі (БСМ). Акупацыйныя ўлады не забаранялі нацыянальную сімволіку, тым самым дэманстравалі, што яны добра ставяцца да беларускага народа. Аднак аніводнай вышэйшай навучальнай установы яны не адкрылі. Мэта «народных школ», па меркаванні кіраўнікоў рэйха, была

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падрыхтаваць лаяльных пісьменных рабочых для Германіі. Бацькам, якія не адпраўлялі дзяцей у школу, акупанты пагражалі карай. Аднак па многіх прычынах дзеці не вучыліся ў «народных школах».

Дзейнасць «народных школ», іх ідэйная накіраванасць супярэчылі ідэалагічнай палітыцы ЦК КП(б) Беларусі, а таму былі прыняты меры па закрыцці гэтых школ. Многія школы былі закрыты не акупантамі, а партызанамі. Дырэктару школы або настаўніку партызанскія кіраўнікі пад пагрозай расстрэлу загадвалі закрыць школу.

Як сведчаць гісторыкі, у той час існавалі дзе-нідзе і «тайныя школы», у якіх настаўнік употай збіраў на заняткі ў нейкай хаце дзяцей. У партызанскіх зонах і на партызанскіх базах ствараліся «лясныя школы», у якіх умовы для навучання былі самыя горшыя, зусім непрыстасаваныя.

Пасля вызвалення ад нацысцкіх акупантаў з верасня 1944 г. адкрываюцца пачатковыя школы ў многіх беларускіх вёсках: амаль у кожнай вялікай, а ў малых – дык адна на 2–4 вёскі. Напрыклад, былі школы ў Ручыцы, Урэччы, Папоўцах, Кузьмішках. Заняткі вяліся ў дзве змены, вучні былі рознага ўзросту – ад 7 да 12 гадоў. У пачатковай школе было 4 класы. Некаторыя вучні-пераросткі заканчвалі 1–2-і класы і пакідалі школу. На пачатку 1950-х гг. у вёсках, якія былі цэнтрамі сельсаветаў, адкрыліся сямігадовыя (7-класныя няпоўныя сярэднія) школы. Сярэднія (10-класныя) школы існавалі ў гарадах і мястэчках (Вілейка, Войстам, Куранец, Мядзел).

У 1950-х гг. сямігадовая адукацыя пашыраецца – адкрываюцца такія школы ў звычайных вёсках: Нароча, Цынцавічы, Слабада, Кавалі, Любань. Навучанне ў сямігадовых школах было бясплатнае. Пасля сямігодкі можна было паступіць у тэхнікум або медыцынскае ці педагагічнае вучылішча. У прафесійна-тэхнічныя вучылішчы (былыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ФЗВ – фабрычна-заводскія вучылішчы) прымалі пасля сканчэння школы, якая мела 4 класы.

У 1955 г. у Савецкім Саюзе быў узяты курс на паступовы пераход навучання школьнікаў на атрыманне імі сярэдняй адукацыі. Многія сямігадовыя школыператварылі ў сярэднія (10-класныя). Тады адмянілі плату за навучанне. Сярэднімі школамі сталі Занарацкая, Любанская, Іжская, Рускасельская, Сваткаўская.

У 1950-х гг. гэтыя школы зрабілі першы выпуск вучняў з атэстатамі сталасці. Выпускнікі мелі права паступаць ва ўніверсітэты і інстытуты.

Пасля вайны настаўнікаў у школах не хапала. Дзеючы тады Маладзечанскі настаўніцкі інстытут не даваў вышэйшай адукацыі. Настаўнікамі ў старэйшых класах працавалі і выпускнікі педагагічных вучылішчаў. Здаралася іншы раз, што за партай у 9-м ці 10-м класе сядзеў 19-гадовы вучань, а вучыў яго настаўнік, які быў яго равеснікам. Можна ўпэўнена сцвярджаць, што 50–60-я гг. мінулага стагоддзя былі часам пачатку росквіту адукацыі і асветы. Гэта дазволіла ў далейшым перайсці да атрымання ўсімі вучнямі сярэдняй адукацыі.

У 1960-х гг. цэрквы закрываюцца. На берагах Нарачанкі засталася дзеючай толькі Гануцкая царква. На пачатку 1970-х гг. памяншаецца колькасць сельскага насельніцтва, скарачаецца і нараджальнасць. Дзяцей у вёсках становіцца меней. Нават адкрытыя ў калгасах дзіцячыя садкі праз некалькі гадоў становяцца ўжо незапатрабаванымі, і іх закрываюць. Праводзіцца ў 1970-х гг. узбуйненне сельсаветаў, а праз нейкі час сярэднія школы ператвараюцца ў базавую школу, а потым базавая – у пачатковую, і нарэшце многія школы ліквідуюцца зусім. Такое здарылася з Рускасельскай школай. Закрылася ў вёсцы і паштовае аддзяленне.
У Бараўцах дзейнічалі клуб і базавая школа, паштовае аддзяленне. Цяпер іх там няма. У Каралеўцах быў клуб,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнічала пачатковая школа, зараз іх ужо няма. Нядаўна пабудавана і дзейнічае там новая капліца.

У 2012 г. у Нарачанскім краі засталіся толькі сярэднія школы – Занарацкая, Нароцкая ў Вілейскім раёне, крыху далей – Чурлёнская, Любанская, Сваткаўская ды Войстамская. Іжская сярэдняя школа ператворана ў базавую. Слабадская і Цынцавіцкая базавыя школы закрыты ў мінулым стагоддзі. Пачатковых школ у нашым краі зусім не засталося. Цяпер пачатковыя класы існуюць у сярэдніх і базавых школах. Некаторыя школы ў пачатку XXI ст. ператвораны ў вучэбна-педагагічныя комплексы, дзе спалучаюцца дзіцячы сад-школа. Такі вучэбна-педагагічны комплекс дзейнічае ў Іжы. У аграгарадках Занарач, Нарач, Любань, Сваткі дзіцячы сад і школы існуюць як самастойныя ўстановы. У кожным аграгарадку ёсць свой сельскі Дом культуры.

На жаль, сучасныя вёскі ў параўнанні з вёскамі 1960-х гг. у галіне культуры, культурнай памяці шмат чаго страцілі. І найгоршыя наступствы – гэта перарваная культурная сувязь пакаленняў, пагроза нябыту духоўнага скарбу продкаў. Гэта, здаецца, і найпершая задача ў сферы сучаснай айчыннай адукацыі і культуры.

1. *Барыс, С.* Нарачанка і яе берагі / С. Барыс, А. Рогач. – Мінск, 2013.

2. *Гошкевич, И.И.* Виленская губерния : полный список населенных мест со статистическими данными о каждом поселении / И.И. Гошкевич. – Вильна, 1905.

3. *Летопись* церковно-приходская Нарочской Свято-Ильинской церкви Вилейского уезда // Вилейский историко-краеведческий музей. КП 7059.

4. *Найдзюк, Я.* Беларусь учора і сяньня : папулярны нарыс з гісторыі Беларусі / Я. Найдзюк, І. Касяк. – Мінск, 1993.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. *Памяць :* гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : Вілейскі раён. – Мінск, 2003 ; Мядзельскі раён. – Мінск, 1998 ; Смаргонскі раён. – Мінск, 2004. На беларус. і рус. мовах.

6. *Смілавіцкі, Л.* Невядомыя старонкі беларускай школы (1941–1944 гг.) / Л. Смілавіцкі // Полымя. – 1994. – № 12.

7. *Список* населенных мест Минской губернии с указанием волостей, сельских обществ и церковных приходов. – Минск, 1870.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ